# Развіццё маўлення

## Тэксты
## для дадатковага чытання

**4 клас**

Складальнік
А. М. Маладцова

Дапаможнік для вучняў
устаноў агульнай сярэдняй адукацыі

М а з ы р
"Выснова"
2 0 2 1

УДК 811.161.3(075.3=161.1)
ББК 81.2Беи-922я2
Р17

Складальнік **А. М. Маладцова**

Р17 **Развіццё** маўлення. Тэксты для дадатковага чытання. 4 клас : дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі / [склад. А. М. Маладцова]. — Мазыр : Выснова, 2021. — 68 с. : іл.

ISBN 978-985-27-1047-3.

У дадзеным выданні змешчаны творы для дадатковага чытання вучняў 4 класа па прадмеце "Літаратурнае чытанне", яны могуць быць выкарыстаны на ўроку для калектыўнай работы ў час пазакласнага чытання, дадатковага задання пры дыферэнцыйнай рабоце з вучнямі, а таксама на стымулюючых занятках.

Матэрыял скампанаваны па тэмах вучэбных заняткаў. Паслядоўнасць тэм адпавядае каляндарна-тэматычнаму планаванню.

**УДК 811.161.3(075.3=161.1)**
**ББК 81.2Беи-922я2**

# Дарагі вучань!

З дапаможнікам па чытанні ты працягнеш цікавае падарожжа да роднай мовы.

Невялікія ўступныя тэксты дапамогуць табе зразумець назвы тэм. Змест твораў паспрыяе разуменню мовы роднай прыроды, пазнаеш хараство сямейных і сяброўскіх зносін, разнастайныя цуды і таямніцы жыцця, адкрыеш сваё чулае сэрца міласэрнасці.

Пазнавальныя творы чытанкі дапамогуць не толькі правільна і бегла чытаць, але разумець сэнс і галоўную думку твора. Пытанні і заданні паспрыяюць развіццю актыўнай слухацкай пазіцыі, маўлення, памяці і мыслення.

Поспехаў табе!

Умоўныя абазначэнні:

— размінка

— заданні

РМ — развіццё мовы

— слоўнік

— пытанні

**РМ** З апорай на выдзеленыя словы складзіце апісанне верасня. Каго ён вам нагадвае? Чаму?

## Верасень

**Абходзіць верасень** лясы
З няпамятных часоў.
**Тырчаць**-тапырацца **вусы**
З блакітных верасоў.

Таемнай сцежкаю ідзе
Пад ветру спеўны свіст.
Блішчыць **у доўгай барадзе**
Зжаўцелы першы ліст.

Калі ж прыстане ідучы, —
Зацемніцца прастор,
Успыхне зырка **на плячы**
Карзіна вабных зор.

Кіруе светам цішыня
Пад сховаю начы.
І **будзе** верасень да дня
Дары свае **лічыць**.

**Рукой** вятрыстай **вытра пот**,
**Прылёгшы на спачын**.
І кіне звыше ў мох балот
Сузор’е журавін.

*Мікола Мятліцкі* [4, с. 41, 2012]

отдельное жилище[1], приданое[2].

Глыбела неба, зоркі халаднелі.
Ступала восень зорнай паласой.
Апошні мёд насілі пчолы ў келлі[1]

# ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА

Прырода — неад’емная частка нашай Радзімы. Ахоўваць прыроду, берагчы яе, ашчадна адносіцца — гэта значыць берагчы сваю Радзіму. Чалавек і прырода — непадзельнае цэлае [1].

Выдзеленыя літары вымаўляйце грамчэй за іншыя.

Ле**Т**няй рані**Ц**ай, бывае,
Пла**Ч**уць т**Р**авы лу**Г**авыя.
**Х**то з вас, **ДЗ**еці, а**Д**га**Д**ае,
Як заву**ЦЦ**а слё**З**кі тыя?

*Анатоль Зэкаў* [2, с. 15, № 6, 2010]

Асенняе лісце схавала літару галоснага гука. Здагадайцеся, якую. Устаўце яе.

_ = □

**Восень**

Паляцела л_та
З птушкамі на поўдз_нь.
Ні травы, ні кв_так,
Пуста ў агародзе.
Вец_р гоніць лісцік,
Скурчаны, счарн_лы.

Коціцца кудысьці
Ён, асірацелы.
Голы сад знясм_лы
Да сябе н_ кліча,
Неба пацямн_ла
І цяпла н_ зыча.

*Н. Галіноўская* [3]

1. Якая пара года апісваецца ў вершы? Як вы аб гэтым здагадаліся?
2. Якім настроем прасякнуты верш: сумным, вясёлым, звычайным?
3. Як апісана пустэча ў садзе? Падкрэсліце гэтыя словы.
4. Чаму лісцік асірацеў? Чым раней да сябе клікаў сад?
5. Чаму пацямнела неба? З кім паляцела лета на поўдзень? З якой мэтай?





На санцагрэве з буйных верасоў.
За жураўліным клінам павуцінка
Плыла трывожна з восеньскай вярсты.
...Яшчэ сініцам весела адцінькаць
У голлейку пажоўклыя лісты.
А там дажджы рабінай апякуцца,
І выпадзе халодная раса...
Не, не мае красёнцы гэта ткуцца,
Не мой — халоднай восені пасаг[2].

І не мае то вусны загарчылі
Салодкім мёдам позніх верасоў...
І сняцца сны ўспамінамі чужымі.
Ступала восень зорнай паласой.

*А. Канапелька* [3]



☆ Растлумачце значэнне слоў і словазлучэнняў верша.

Зорная паласа – ________________________________,
санцагрэў – ____________________________________,
весела адцінькаць – _____________________________,
трывожна плыла – _______________________________,
рабінай апякуцца – ______________________________,
красёнцы ткуцца – ______________________________,
вусны загарчылі – _______________________________,
ступала восень – ________________________________,
сны з успамінамі чужымі – ______________________.

? 1. У якую пару года адбываецца дзеянне? Як вы даведаліся?
2. Чаму пчолы будуць несці *апошні* мёд у келлі? З якіх *раслін* ён будзе? Як ён *называецца*? Чаму вусны будуць *гарчыць*?

# ЗМЕСТ


Дарагі вучань! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 4

ЧАЛАВЕК І ЯГО РОД . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8

ЧАЛАВЕК І РАДЗІМА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16

ЧАЛАВЕК, СЛОВА І КНІГА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22

ЧАЛАВЕК І МАСТАЦТВА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25

БЫЦЬ НА ЗЯМЛІ ЧАЛАВЕКАМ . . . . . . . . . . . . . . . . . 30

ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42

ЧАЛАВЕК НА ПЛАНЕЦЕ ЗЯМЛЯ . . . . . . . . . . . . . . . . 47

ЛЁС ЧАЛАВЕКА НА ВАЙНЕ . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52

ЧАЛАВЕК, КОСМАС І СУСВЕТ . . . . . . . . . . . . . . . . . 59

Літаратура . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66